это, прежде всего, инструмент, который позволяет решить проблемы перевода или повысить эффективность труда переводчика только при грамотном и рациональном его использовании. Речь пока не может идти о полной замене переводчика в данном сложнейшем процессе, и это утверждение основывается на ряде выявленных в системах машинного перевода недостатков, подтверждающих: современные компьютерные технологии всё еще не могут обеспечить полностью автоматизированный машинный перевод. Однако это ни в какой мере не должно снижать интереса к развитию данной области науки и техники.

**Литература**


1 Интернет-журнал «Вокруг света» [Электронный ресурс] / Научно-популярный интернет-портал. – Режим доступа: http://www.vokrugsveta.-ru/chronograph/2683/. – Дата доступа: 10.04.2016.

2 Кузнецов, П. С. Основные проблемы машинного перевода. Вопросы языкознания / П. С. Кузнецов, А. А. Ляпунов, А. А. Реформатский; под ред. П. С. Кузнецова // Вопросы языкознания, 1956, № 5. – 107 с.

3 Гавриленко, Н. И. Возможные пути использования информационных технологий при подготовке переводчика в сфере профессиональной коммуникации [Электронный ресурс] / Н. И. Гавриленко // Школа дидактики перевода. – 2016. – Режим доступа: http://www.gavrilenko-nn.ru/publications/ – Дата доступа: 13.05.2016.

4 Рябова, М. Ю. Информационные технологии в образовании: проблемы машинного перевода [Электронный ресурс] / М. Ю. Рябова // Машинный перевод: актуальные проблемы и вопросы. – 2013. – Режим доступа: http://ict.edu.ru/vconf/files/3518.doc. – Дата доступа: 03.04.2016.

5 Баканова, М. В. Информационные технологии в обучении профессиональному переводу / М. В. Баканова // Научный журнал «Научные исследования в образовании». – LAP LambertAcademic Publishing Gmb&Co.Kg. – С. 77–78.



**УДК 398.3(476.2-37Светлагорск)**



***А. Д. Дакукін***


## НІЖЭЙШАЯ МІФАЛОГІЯ СВЕТЛАГОРШЧЫНЫ


*Артыкул прысвечаны даследаванню ніжэйшага ўзроўню міфалагічнай свядомасці беларусаў, у прыватнасці жыхароў Светлагорскага раёна. На багатым фактычным матэрыяле разгледжаны вобразы персанажаў ніжэйшай міфалогіі, звесткі пра якіх былі запісаны ў экспедыцыях на тэрыторыі вышэйназванай мясцовасці. Аўтарам звернута ўвага на знешні выгляд, месцазнаходжанне і функцыянальнасць найбольш распаўсюджаных у мясцовых вераваннях вобразаў народнай дэманалогіі (вадзянік, дамавік, лясун і чорт).*


Традыцыйная народная міфалогія, у прыватнасці ніжэйшая, якая бярэ свой пачатак у далёкім мінулым, працягвае існаваць і сёння. Пры гэтым яна плённа развіваецца: знікаюць ці пераасэнсоўваюцца звесткі пра персанажаў ніжэйшай міфалогіі, прычым, паводле народных вераванняў, яны насяляюць ужо не толькі прыродныя, але і ўрбаністычныя аб’екты. Заслугоўвае ўвагі меркаванне даследчыка У. Васілевіча, які слушна адзначыў наступнае: “Багамі і дэманічнымі істотамі ў беларусаў некалі была напоўненая ўся навакольная прырода – ад зямных нетраў да недасягальнага Космасу.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Фантастычныя істоты насялялі лясы, палі, рэкі, ім знаходзілася месца ў хатах, на гарышчах, у коміне, падпеччы, у лазні, хляве і іншых гаспадарчых пабудовах. На іх ўскладалася апекаванне свойскай жывёлаю і палеткамі, яны павінны быліназіраць за ўсімі гаспадарчымі працэсамі і клопатамі селяніна” [1, с. 16–17]. Калі ж справа датычылася пэўных адмоўных істот, то “сваіх міфічных антыгерояў народ ствараў паводле сваіх жа чалавечых заганаў і хібаў, не ашчаджаючы самых брудных фарбаў на іх пачварныя партрэты. Ну, а калі чаго ў гэтым жыцці не хапала для каларытнасці сюжэта, абмалёўкі знешнасці ці характару, у ход ішла нястрымная фантазія” [1, с. 17].

Разгледзім найбольш распаўсюджаныя вобразы народнай дэманалогіі, абапіраючыся на фальклорныя матэрыялы, архіўныя і ўласна запісаныя ў Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці.

Хоць персанажы ніжэйшай міфалогіі ў народных уяўленнях адрозніваюцца па знешнім выглядзе, месцы жыхарства і функцыях, але, як нам распавядаюць інфарманты, усе яны з’яўляюцца “чарцямі”, прычым іх вонкавае аблічча залежыць ад навакольнага свету. Так, калі чорт жыве ў балоце, то становіцца вадзяніком, калі ў лесе – лесавіком і інш.: *“Это всё черти, способные превращаться во всё. Когда чертей гонят из дома крестом или святой водой, то они убегают. Когда они бегут через лес, его можно увидеть, обцепленного ветками, потому что он бежит по кустам – это лесовик. Когда по речке бегут – приобретают форму лягушки, воденика. Они не любят чистой воды. Вся эта нечесть является чертями, которые бегут в разные стороны, спасаясь от креста, все эти воденики, лесуны и превращаются”* (запісана ў г. Светлагорск ад Верамяюк Святланы Васільеўны, 1974 г. н.).

Засяродзім увагу на найбольш распаўсюджаных у мясцовай традыцыі вобразах народнай дэманалогіі: вадзяніка, дамавіка, лесавіка, чорта.

Паводле ўяўленняў, вадзянік з’яўляецца жыхаром водных аб’ектаў, іх гаспадаром. Любіць стаячыя азёры, але можа знаходзіцца ў любой вадзе: *“У вадзе заўсёды абітаіць вадзяны. Ён жыве практычна на дне возера. Ён лічыцца гаспадаром возера. Не нравіцца яму, калі хто яго возера баламуціць. На выгляд ён весь у расценіях водных, бо ён гаспадар возера. Калі хто не панравіцца, так можа і да сябе زаташчыць ілі зрабіць, каб сударага ногі свяла. На выгляд ён стары, как дзед, з барадой, а ў барадзе могуць і ракі быць, іл усякі”* (запісана ў г. п. Парычы ад Звягавай Алены Канстанцінаўны, 1938 г. н.) [2, с. 35]. Вадзянік як уладар рэк, азёр і балотнік, які жыве ў дрыгве, не вылучаюцца, як вынікае з фактычных матэрыялаў, у якасці асобных персанажаў, месца жыхарства якіх звязана з вадой. У сувязі з гэтым можна меркаваць, што любога нячысціка як жыхара вады на Светлагоршчыне называюць вадзяніком.

Выгляд вадзяніка антрапаморфны. Нагадвае ён старога з барадой, які рухаецца на вялікім саме. Калі гэты нячысцік выходзіць на пэўны час з вады, то можа засохнуць, ператварыўшыся ў корч. Калі кінуць яго зноў у ваду – ён ажыве: “*Вадзянік – ета такі нячысцік, што жыве ў вадзе. Ён сільна быстра плавае. Паміж ног ён мае перапонкі. І шчэ плавае на сому. Бывае, што ён вылазіць на бераг, толькі на трошкі, бо можа засохнуць. Бывае, што і засыхаў. Такія вот, бачыма, на балотах якіх карчы стаяць у ціне, гразі – так ета вадзянік. Ён можа ажыць. Толькі вот нада еты корч абратна кінуць у ваду. Тады ўжэ абязацельна ажыве і зразу ж паплыве. Ужэ шчасліві той чалавек, што закінуў еты корч. Вадзяны будзе благадарны: рыбу ў сеткі заганяць будзе, калі тапіцца будзеш – выташчыць”* (запісана ў в. Пятровічы ад Пузына Таццяны Пятроўны, 1925 г. н.) [2, с. 35–36]. Зафіксаваны і выпадкі, калі вадзянік нагадвае адначасова і чалавека, і нейкую жывёлу, накшталт жабы ці рыбы: “*Голова у него, как у лягушки. Похож на человека, усы красивые, как у кота. Сам он синего цвета, сине-зелёного, даже болотного. На голове – огромный чырвоный плавник, который спускается по спине вниз. Его конечности, как у лягушки, закруглённые, имеют перепонки. Как таковую одежду не носит. Глаза у него такие, как у человека, только*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*круглые, как у рыбы или у лягушки. Сам по себе вредный, любит пакостить. Обитает в стоячих водоёмах, где нет течения, там болота, озерки. Он затаскивает нерадивых людей. Сам он никого не гонит, но если кто-то попал в воду, может схватить и потащить на дно. Что он там с ними делает, я не знаю"* (запісана ў г. Светлагорск ад Верамяюк Святланы Васільеўны, 1974 г. н.).

Дадзены міфалагічны персанаж успрымаецца хутчэй як нешта шкоднае. Напрыклад, можа тапіць людзей, у выніку чаго з'яўляюцца новыя вадзянікі і русалкі: *"Вадзянік – гэта хазяін вадаёма. Ён любіць жыць ля млыноў, пад шлюзамі. Ён топіць людзей, якія яму нравяцца. Еслі эта хлопец, то будзе вадзяніком, а еслі дзеўка – русалкаю"* (запісана ў в. Хутар ад Казловай Анастасіі Яўхімаўны, 1929 г. н.) [2, с. 36].

Цікава, што ў сучасным фальклорным працэсе назіраецца актыўная трансляцыя звестак, у выніку чаго ў народных уяўленнях прадстаўнікоў маладзейшага пакалення гэты вобраз (як і іншых нячысцікаў таксама) стасуецца з агульнанароднымі характарыстыкамі, шмат у чым паўтараючыся з імі: *"Дед бородатый, весь в водорослях. Глаза большие. Живёт в болоте под пнём, трясине. Он хороший, помогает в болоте не утонуть, иногда показывает дорогу тем, кто заблудился. Если водяной утопил, то станешь водяным. Русалка – это его любовница"* (запісана ў г. Светлагорск ад Кораба Андрэя Юр'евіча, 1997 г. н.). З вышэйпрыведзенага апісання вынікае ўжо станоўчая характарыстыка персанажа. Можна меркаваць, што вадзянік надзелены амбівалентнымі функцыямі, якія залежаць ад яго характару, настрою і інш.

Істотай, якая пастаянна знаходзіцца ў хаце, з'яўляецца дамавік. Ён нагадвае маленькага чалавека, часта сівога і з вусамі, які жыве пад печчу і ўсяляк ахоўвае побыт і гаспадарку сям'і: *"Дамавік – ета маленькі белабрысы старычок з вялікай барадой і вусамі, як у ката. Ножкі тыя кароценькія. І ён топ-топ, тупае па хаце. Маці казала: "О, Топа аб'явіўся!" І мы верылі, што гэта іменна той Топа, які шуміць дзе-та. Таму і любілі яго, хоць і ня бачылі"* (запісана ў в. Асінаўка ад Цвірчанка Надзеі Станіславаўны, 1929 г. н.) [2, с. 146]; "*Маленький пузатенький, средних лет. Рубаха белая с орнаментом, штаны обычные, пояс красивый, лапти. Весёлый, трудолюбивый. Живет под печкой, в квартире – под плитой или холодильником"* (запісана ў г. Светлагорск ад Кораба Андрэя Юр'евіча, 1997 г. н.). Каб забяспечыць у працы спор і засцерагчыся ад дамавіка, яму прыносілі ласункі і прасілі яго аб чым-небудзь: *"Кажуць, што дамавы ё ў кожнай хаце. Я его не бачыла, а маці казала, што ён жыве пад печчу ці за прыпечкам. Гэта нейкі сівы дзядок. А вот калі ўжэ я сама стала дзяржаць хазяйства, панадабілася і мне прасіць помашчы ў етага дамавіка. Нешта карова мая не стала прыносіць малако, а я ўжэ не знаю, што рабіць. А тут саседка і падсказала. Узяла я даматканы рушнік, стакан вады, хлеба і соль. Палезла на крышу і кажу: "Дамавіча, дамавы, на табе хлеба, вады і соль, дай маёй карове малака даволі". От не помню толькі, ці стала лепей, ці не"* (запісана ў в. Дуброва ад Масальскай Анастасіі Карпаўны, 1922 г. н.) [2, с. 146]. Сярод экспедыцыйных фальклорных матэрыялаў сустракаюцца таксама і прыклады супрацьлеглага, варожага і адмоўнага апісання гэтага міфалагічнага персанажа: *"Домовиками черти становятся, чтобы сбить с истинного пути. Сначала они помогают, но по ночам они внушают мысли, чтоб сбить людей с истинного пути, поэтому если они живут в доме, где всегда чисто, в окрещенном доме, то долго там не могут жить, и покидают жилище и превращаются в иншую нечисть"* (запісана ў г. Светлагорск ад Верамяюк Святланы Васільеўны, 1974 г. н.).

Уладар лесу – лесавік – меў выгляд старога з доўгай сівой барадой. Галоўным заняткам яго была падтрымка ладу ў лесе. Ён мог ці то заблытваць, ці то дапамагаць ім выйсці з гушчару, у залежнасці ад настрою: *"Дед, на голове соломенная шапка с шишками, бородатый (белая борода), седой. Живёт в лесу. Рубаха белая, наверху безрукавка коричневая, лапти соломенные. Когда плохое настроение – может поиздеваться, в хорошем – помочь. Живёт в лесу в маленькой избушке из кругляка, общается с животными"* (запісана ў г. Светлагорск ад Кораба Андрэя Юр'евіча, 1997 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адным з найбольш распаўсюджаных персанажаў ніжэйшай міфалогіі варта назваць чорта. Аповедаў пра яго знешні выгляд, функцыі, паходжанне і інш. вельмі шмат. Напрыклад, ёсць меркаванне, што чэрці ўтварыліся ад анёлаў: *“Во, пра чорта мне бабка мая казала. З Богам ангелы лятали. А некаторыя захацелі так, як і Бог, стварыць чалавека і жывёл, але не змаглі, і так яны счарнелі ад злосці, выраслі ў іх рагі, капыты, хвост. Так і пайшлі ад таго часу чэрці. Людзі ж кажуць: “Злы як чорт”* (запісана ў г. п. Парычы ад Скуднай Тамары Нілаўны, 1929 г. н.) [2, с. 246]. Здзіўляе і аблічча дадзенай істоты, якое можа быць розным. Адны інфарманты прыгадваюць звесткі пра поўсць чорнага колеру (і звязваюць словы “чорны” і “чорт” паміж сабою), а іншыя ж, наадварот, распавядаюць пра “стварэнне маленькага памеру карычневага колеру”: *“Чёрный, рогатый, весь в шерсти чёрной, лохматый такой, с маленькими рожками-закорючками, нос, как у поросёнка. Хвост и руки и копыта. Любитель пошутить. Любит деньги. Живёт в аду с Сатаной. Бездельничает, издевается над людьми”* (запісана ў г. Светлагорск ад Кораба Андрэя Юр’евіча, 1997 г. н.); “*Такое низкое существо, по пояс. Вместо ног у него копыта, имеет коричневую шерсть, рожки, как у баранчика, непрямые такие, закруглённые. Есть носик, как у собачки больше похож. Глазки такие, какие у человека. Хвост такой длинный, заострённый на конце, иногда он может быть маленький, коротенький. Иногда может иметь вилы. Они обитают везде, им более приятна среда особых людей (колдуньи, пьяницы). На последней стадии жизни пьяницы, когда они упиваются, черти берут вилы и начинают колоть в бок, поэтому у них болит нутро. Также при помощи этих вил они гонят прямо в преисподнюю. Чертей можно ещё прогонять. Чтобы их прогнать, надо все углы окроплять святой водой, все углы дома. Ещё они могут приходить во сне и наставлять человека на неправильный путь”* (запісана ў г. Светлагорск ад Верамяюк Святланы Васільеўны, 1974 г. н.).

Успрыманне чорта выключна адмоўнае. Ён можа прыносіць як маленькую шкоду, так і ўсеагульную бяду, прычым вельмі любіць гэта рабіць рукамі самога чалавека: *“…Матка захацела паглядзець, чаго сабака брэша. Яна пайшла, але хутка прыбегла да бацькі, каб той выйшаў і паглядзеў на дзіва – у нашым агародзе быў голы чалавек. Ён сеў на калені, рыў рукамі зямлю і рыкаў, як тая свіння. Страшна было на такое глядзець… Я не помню, што была далей, але потым старыя гаварылі, што гэта чорт усяліўся ў гэтага чалавека”* (запісана ў в. Славань ад Гвоздзь Любові Рыгораўны, 1943 г. н.) [2, с. 245–246]. Можна выказаць думку, што менавіта па гэтай прычыне малым дзецям не дазвалялі “рухаць нагамі” пры сядзенні, бо лічылася, што ў гэты час на іх сядзяць чэрці: *“Нельга сядзець і хістаць нагамі, бо тады на іх бесы гойдаюцца”* (запісана ў г. Светлагорск ад Манкевіч Юліі Мікалаеўны, 1924 г. н.). У якасці аховы ад дадзеных істот “жагналіся” (хрысціліся), чыталі малітвы, выкарыстоўвалі свянцоную ваду.

Як бачна, ніжэйшая міфалогія – з’ява шматгранная і жывая. Дагэтуль бытуе мноства былічак, звязаных з яе персанажамі. Найбольш распаўсюджанымі і шырока прадстаўленымі істотамі на Светлагоршчыне варта назваць вадзяніка, лесавіка, дамавіка і чорта, характэрнай прыметай якіх з’яўляецца амбівалентнасць функцый. Але найчасцей стаўленне людзей да іх адмоўнае, а для засцярогі ад звышнатуральнага ўздзеяння дэманаў у народзе было прынята выкарыстоўваць малітвы, святую ваду.

**Літаратура**

1 Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад., прадм., перакл. і паказ. У. Васілевіча. – Кніга 3. – Мінск : Беларусь, 2010. – 717 с.

2 Беларуская міфалогія. Хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік / уклад. В. С. Новак. – Мінск: РІВШ, 2013. – 394 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ